БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

рэс рэдакцыі і адміністрацыі:
пухоўская вул. д. № 12

кцыя адчынена ад 1 да 2 гадз.
пасьля поудня.
ністрацыя—зрана ад 10 да 2 гадз.
У вечары ад 5 да 7 гадз.

кцыя пакідае за сабой права па-
ляць перасыланые рукапісы і ка-
рэспандэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 к.

Падпіска з дастаукай да дому у Мін-
ску на 1 месяц 3 руб.

Цана абвестак:
за верш пэтыту на 1-й стр. 1 руб.
на зношняй—50 к.

№ 80. Менск. Серада 3 ліпня 1918 г. Год I

АБВЕСТКА.

Бульбяная мука уселякаго роду рэквізуецца. Меньш фунтау ад рэквізыцый асвабаджаецца. Прыемная цана марак за пуд.

Камэндант
НАГЭЛЬ.
Генэрал-лейтэнант.

Менск 3/VII.

Новы хлеб.

Даждж**ы** направілі паля. Нісеу хлебоу усе такі есьць ліхі. Маенткі засеяліся налавіну. Жывелы і гною за гады паменьшало. У нас йоп скатаводства і картоплі. еларусь у 1910 гаду увазіла сябе з Украіны і палудзеных губэрній 20 мільенау пуу хлеба. Месты слі і пшачны хлеб прывозны. Менская б. вывозіла праз сваі ст. д. 3.282 тысячы пудоу; а вазілася сюды 7,150 тыс. уд. Месты і мястэчкі зьедалі .842 тыс. пуд.

1910 г. быу ураджайны. ельская гаспадарка была нармальная. Цяпер гаспадарка моцна падарвана. Рэзультат ураджаю, можэ быць, і пракорміць 3—4 месяцы месты, а потым запасы скончуцца, як гэта і цяпер масць мейсца. Цяпер па вёсках налавіна селян ні маюць ужо хлеба. А гэтыя месяцы ліпень, жнівень патрабуюць 16 гадзінавай працы у дзень,—трэба моцнаго харчу. Мы маем у руках статыстыку адной падмінскай багатай воласьці. Жыхароу 11.281 душ. Засеяна жыта каля 3415 дзесяцін, у нас на селянскіх шнурах пайбольшы збор 40 пуд. с дзесяціны, усяго проблематычна урожай максімальны выйдзе па 12 пудоу на душу. Калі палічыць, што пэуная часьць будзе рэквізована, другая часьць на корм сямьі, то у тарговы абарот для мест можэ папасьці вельмі мала. Без прывозу у месты з Украіны абыйсьціся ні можэм. Бульбы і яровых засеяна меньш, як заусягды. Насення ні было.

У маентках «камісары» з армейскіх соцыялістау зністожылі усе запасы ячменя, ауса і бульбы. За 4—5 тыдняу мы ужо будзем есьці новы хлеб і сьвежую бульбу у волю, і гэта можа быць да Каляд, а тагды трэба уже каб быу прывоз з Украіны.

Месты і мястэчкі у нас елі больш пшанічны хлеб, а жытняго тутэйшаго хлеба столькі ні ужывалі. Прывоз пшанічнай мукі у месты, паменьшыць патрэбы у жытнім хлебе.

А. У.

Купля зямлі.

Можна куплянь і прадаваць зямлю. Натарыусы па тлумачэнню нямецкай акупацыйнай улады могуць рабіць купчыя. Ад гэтаго зрабіўся вялікі грошавы рух. Багацейшыя селяне купляюць ад памешчікаў зямлю вучасткамі. Цана ад 200 руб. да 1000 за дзесяціну. Беда у тым, што селянскі банк эвакуаваўся, парцэляцыоннаго банку німа. Купляецца земля безпарадачнымі кавалкамі, шнурамі, аб правільнай конфігурацыі німа гутаркі, аб прырэзцы купленай зямлі да вёскі, каб потым разбіць на хутары, закона у нас німа. Трэба найхутчэй Народнаму Сэкрэтарыяту зрабіць праэкт землеустройства.

У канцы канцоў усе грошы досіць вялікія з вёскі пярэйдуць да землеўласьнікаў. Часьць іх пойдзе на палепшэнне гаспадаркі і на лячэння ран ад аграрнай анархіі. Пэўная доля пойдзе на сельска-гаспадарскую індустрыю.

Гэта толькі пачатак мобілізацыі зямлі, бо на руках у селян ні усе грошы,—усе капіталы зложаны у расійскія банкі. Напрыклад, у г. Радашковічах у казённай кассе на почці быко зложэно 840,000 руб. За 1—2 гады пасьля ліквідацыі расійскай разрухі гэтыя грошы можа і знайдуца, тагды і купля зямлі будзе яшчэ маснейшая...

N.

Агульныя весткі.

ГААГА. У адным хлебаробным районе у правінцыі Суффольк [Англія] зарэгістраваны два выпадкі чумы плуцаў, якія кончыліс сьмерцью.

Нідакват паперы у Англіі. «Дэйлі Графік» піша: Дырэкцыяй распредзэлення і пунктамі ашчады паперы выданы новы загад, дзе сказано: тэатральныя білеты павінны быць зьменьшаны на палавіну размера, ужыванне паперовых абвёртак для цукерак забаронено, зьменьшаны каталогі і почта, абразкі да папірос болей ні друкуюцца, пакеты павінны быць упакованы у лёгкую абвёртачную паперу, а на трамваях і омнібусах прэдпісано зьбіраць ужо ужываныя білеты.

СТОКГОЛЬМ, 29/VI. Па саглясу, зробляному паміж Германіяй і Фінляндзіяй, Германія аб'язуецца прэдставіць Фінляндзіі машыны, вуголь, цукер, хімічныя прэпараты і лячэбныя прынадлежнасьці. Фінляндзія аб'язуецца даставіць Германіі лес, паперовую цэллулозу, смалу, скіпідар, медзь, скуру, лой, коней, кондэнсіраванае малако і масло на сумму у 15 мільёнаў фінскіх марак. Паміж аб'ектамі компэнсацыі упамянуто так сама ізобрэтенне фінскаго хіміка Ашана.—у вырабцы штучнаго каучука.

СТОКГОЛЬМ, 26/VI. Згодна афіцыяльным весткам, паміж шведскім, фінляндзкім і германскім урадамі дасьцігнута згода аб ўзмацаваннях на Аландскіх выспах і аб прыступенні да перэговораў з мэтай уладзіць згоду і аб разброенні Аландскіх выспаў.

Вестк і з Расіі.

Пратэст большэвікоў процiу Англіі. Камісарыят заграничных спраў прэдставіў пратэст Англіі, чаму яна трымаець сваі войска на Мурмане. У ноце напісана, што рабочы расійскі народ хоча са усімі народамі быць у згодзе. Прыход англійскіх войск ні выз**ы**ваецца ніякімі агрэсіўнымі выступленнямі расійцаў, бо такіх выступленняў ні было. Нота высказывае надзею, што Англія вывезець войска, сагласна міжнародовому праву, і ні змусіць народ расійскі процiў яго волі ідзі ваеваць з імі.

W. Z.

У Владзівостоку высадзіліся Японскія войска с адміралам Като на помач чэхо-слованкам. Па пэўным вядомасьцям чэхословакамі рукаводзіць штаб саюзнікаў у Харбіне.

W. Z.

Цар жывы.

З Екацэрынбургу прыйшла тэлеграма ад прэдседацеля Савета, што цар жывы, што чуткі аб забійстве—правакацыя.

— **Бэрн.** Згодна адной весткі с Пецярбургу, Савецкі урад афіцыяльна опублікавау, што дзержаўныя даугі у цяперашнім часе даходзяць да 79 мільярдау і 500 мільенау руб.

Рэзалюцыя левых с.-р.

«Заря Россіи» паведамляе: Маскоўская меская конфэрэнцыя левых с.-р. па поваду сьмертнай кары Шчастнаго вынесла рэзалюцыю, у якой гаворыцца, што цэнтральны камітэт партыі павінен адклікаць сваіх прэдстаўнікоў а усіх органоў, прычасных да прывядзэння і выпаўнення сьмертнай кары, і што фракцыя левых эс-эраў павінна узбудзіць пытанне аб сьмертнай кары на маючым быць зьездзі савэтаў і вымагаць прыўлячэння да адпаведальнасьці асоб, вінаватых у аднаўленні адменянай воляй народа сьмертнай кары.

40-лецце В. Г. Короленко.

Нідаўна споўнілося 40-леццe ад дня пачатку літэратурнай працы В. Г. Короленко. Сорок гадоў таму назад 20 (7) чэрвеня у 1878 г. у «Новостяхъ» быў надрукованы першы артыкул В. Г. Короленко: «Апраксинскій погромъ».

З Украіны.

— **Кіеу.** Як паведамляе «Кіевская Мысль», гэтман прыймауши дэлегацыю ад селян с чэтырох украінскіх губэрній, заявіу, што спэцыяльная камісія апрацоувае зямельны закон дзеля увядзення разумных рэформ, на што аднак вымагаецца больш часу. Вялікія землеуласьніцкая землі будуць разделяны дзержаўным зямельным банкам між селян, маючых мала зямлі. Земствы будуць перароблены з мэтай дасьцігнуць стварэния здароваго селянскаго сасловія, як найлепшаго элемэнта народонаселення.

Абразкі с правінцыі.

(Па даугінаускаму гасьцінцу).

Нядзеля. У кузьні каваля Янкеля у мястэчку N цэлае зборышчо—сход: селяне з ваколічных вёсак, у сьвяточны вольны дзянёк зьежджаюцца звычайна да каваля напраўляць свае гаспадарскія прылады. Разам з гэтым кузьня, па традыцыі, с самых даўніх часаў лічыцца у селян свайго роду клюбам, дзе яны даведываюцца аб тым, што чутно на белым сьвеці.

Пры тым, як нацягваюцца новыя шыны на калёсы, як напраўляецца парог, сякера, барана, або падкоўваючы каня,—разбіраюцца усесьветныя палітычныя справы.

Палітыкаў паміж селян хоць адбаўляй. Толькі заўсёды у канцы кожнай гутаркі яны дабіраюцца да «зямелькі» бо земля—квінтэсэнцыя усіх іхных палітычных спраў.

Людзі спрэчаюцца, гарачуцца, пацеюць, пускаюць розныя нібыліцы, а пры самых цяжкіх пытаннях яны зьвертаюцца на разбор цікавых спраў да «чартоўскай галавы», да «кручанаго рэмня — каваля Янкеля. Ен чалавек бывалы і яго рашэнні у палітычных справах маюць сярод селян вялікі аўтарытэт. І ні дзіва, бо ён калісь у Вільні коні падковываў неколькі гадоў падрад і набраўся вялікаго розуму.

Асобна ад усей кампаніі сідзіць старэнькі селянін. Упіраючыся бурымі закарэлымі па-

гамі у гарачы ад сонца пясок, сідзючы на калодзе, ён аб нечым глыбока задумаўся, выціраючы часта свой успацелы зморшчаны твар.

Я падыхожу да яго і пытаюся, чаму ён аддяліўся ад гутарлівай кампаніі. Аказываецца ён мае вялікае нішчасьце—у яго укралі парог с сахі і яму ніякім спосабам ні удалася увайсьці у кантакт с кавалём Янкелям накопта нарогу,—той чалавек цьвёрды, на павер рабіць ні хоча, а тут німа грошай чым заплаціць. Жалезо дараго каштуе, хлебаробу без сахі тое самое, без рукі...

Пры нашай гутарцы ўмешаўся і другі селянін, каторы разсказаў, што вясной і у яго укралі жалезную барану з гумны, але ён уладвіў сабе дрэўляную і неяк абыходзіцца.

Падыйшло ішчэ пара чалавек, а за імі і уся «кампанія». Разбіраючы гаспадарскія справы, відаць было, што за час вайны яны вельмі збіліся с сельска-гаспадарскіх прыладаў. Усюды чуецца гэты нідастатак. На жалезо пайшлі шалёныя цэны.

І вось памятаюцца мне такія словы аднаго селяніна.

«Горад ад нас выкалачывае хлеб. Мае храпку, каб даставаць яго як найтаней. А чаму ён ні стараецца даваць нам жалеза і сельска-гаспадарскіх прыладаў па зноснай цане?».

Падарожны.

Штрыхі.

У панстве «таварышоў».

Як чытаеш якую кольвек, расійскую газэту, выключаючы «Извѣстія», то чуецца усюды якісьці кашмарны, жудасны плач—стогн:

Голад, убіўствы, мяшэчнікі, сьмертныя кары, поркі рабочых розгамі, бітвы па вёсках за прадукты паміж селянамі і чырвонагвардзейцамі, дзе з абодзьвух старон раненыя і забітыя; уцёкі за граніцу лепшых інтэлігентных сіл з Расіі, массовыя зачыненні ні зусім большэвіцкіх часопісаў, арэшты віднейшых расійскіх пісьменнікаў за контр-рэвалюцыю... Словам, цэлы пякельны выбух нейкай сатанінскай Этны, крывое люстэрко розных футурычных «сацыялізацыяў», рэзня «буржуяў», казачныя дзікія хаўтуры Карнілава і інш.

Так і чуецца, што руіны Вязікаросіі пакрываюцца атрутным попелам большэвіцкіх пажарышч, па якіх маршыруюць «асьвабадзіцелі чалавецтва», імправізуючы усё новыя і новыя здзекі над людзьмі. Так і чуюцца балючыя хрыпы і сударгі быўшай грамадзкай вялікай імпэрыі.

А калі будзе канец дзеям гэтых сярэднявекавых фанатыкаў, вялікіх інквізітараў? Калі перэстане чадзіць у паветры гэты сацыяльны сурагат? калі?

Доўга цягнуцца гэтак ні можа, ужо наступае крызыс у гэтай Леніна-Троцкаўскай трасцы.

* * *

Некаторыя думалі, што гэта самая хвароба вельмі пашэсьцная і апасьлівая для усяей Эўропы, але гэто было сказано шмат месяцаў таму пазад,—цяпер ніхто гэтаго ні скажа. Большэвіцкія камісары, уцекаючы за граніцу с кучамі награбованаго золата гэту пошэсьць ні перэпясуць. Цяперашняя Расія ні можа служыць ужо вабнасьцю для самых лявейшых з левых розных сацыялістычных партый культурных Эўропэйскіх народаў. Гэто можа зразумець і малое дзіця.

* * *

Мяшэчніцтво у Расіі ужо далёка дайшло: Ленін і Троцкі з мешкамі за плячымі вандруюць па знішчаных местах і вёсках Расіі, прадаючы ні ходкі ужо таварэц, сфабрыкаваны імі,—«Волю народа».

— Гэй купляйце, людзі добрыя! купляйце таварышы! танна прададзімо—за акраіц хлеба і кавалак сала!..

Ніхто ні купляе... насыціціліся... пакрываецца шлях гэтых мяшэчнікаў усенародным праклянцем.. Пакрываюцца іх сьляды семячкамі і крывёй...

«Буржуй».

МАЛЕНЬКІ ФЭЛЬЕТОН.

З менскай старасьветчыны.

I. КОНКА.

Ні гэрогліфаў старых ні рунаў
Вун па вуліцах нашых сьляды,
Быўшай конкі тут рэйкі, як струны,
Іх тут ладзілі нашы дзяды.
Гэта спадшчына спыненай эры,
Калі меу свой «экспрэсс» наш менчук,
Доўга коні, худыя хімэры,
Шліфавалі нізграбны наш брук.
Пасажыры мадзелі, пацелі,
Памагаючы конку піхаць,
Бо галодныя конікі млелі,—
Ні ўсілах «экспрэсс» той цягаць.
Покуль конка свой «рэйс» ад вакзала
Зрабіць раз да Гары Залатой,
Усе место менчук наш, бывало,
Змаршыруе пяць раз пехатой.
Ой шмат гімнаў тут нашы паэты
Аб «экспрэссі» гатовы сьпеваць,
Бо каханае, роднае гэта
І так люба аб ім успамінаць.
Хай наш Менск у шчыр-дзеях у дагонку
За Эўропай шыбае упярод.
Толькі троху хутчэй быўшай конкі,
Тады «дзякуй» увесь скажа народ.

II. ПУСТЫ ПЬЕДЭСТАЛ.

У скверы маленькім на пляцу Саборным
Дзе лірнік спевае, шарманка с дзяўчынкай,
Дзе шпунт-шалахвост глядзіць вокам дазорным,
Гарланіць, пытае: «пачысьць-мо-бацінкі?»
Дзе семячкі баба людзям прадаець,
Аб розных газэтах газэтчык пяець,
Аб добрых «цыгарках» шуміць дзе гаворка,
Дзе бедны менчук пакупае махорку,
Дзе людзі туд-сюд, нібы зрушаны шквал,
На узгорку стаіць пьедэстал.
Каліс на ім бюст Александра другога,
Тарашчыўшы вочы, стаяў ганарова.
Малілась яму чарнасоценцаў многа,
Вакол гардавік вартаваў тут здаровы.
Сьпевалі яму Солоневіч, Курлоў,
Шпігоўскую піць Мэндэль Шоффэр тут плеў.
Год трэці таму як зьнялі добрадзея—
Пабрыў Александр багажом у Расію.
Цяпер жа пусты пьедэстал тут стаіць.
Над ім толькі вецяр гудзіць.
Йдуць байкі у народзі аб людзях тутэйшых,
Жадаючых Менск свой на ногі паставіць,
Што нібы між іх с патрыотаў сьмялейшых
Жадаюць і помнік сабе тут паставіць.
І кожны у марах лунае на сквер
У гордасьці велькай бяз мер.
Вось хтось к пьедэсталу драбіну надставіў,
Узабраўся на верх. Сваю постаць направіў,
У вышку глядзіць, як афінскі той бог,—
Увесь Менск у яго каля ног...

Менчук.

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

Да прыезду р.-к. епіскапа. Па загаду вышэйшых нямецкіх уласьцей асвабаджаны у месьці ад рэквізыцыі б. дваранскі дом (рог Петрапаулоўскай і падгорнай вуліц) разам з абстаноўкай для назначанаго у Менск р.-к. епіскапа Лозінскаго, прыбываючаго гэтымі днямі.

Прыгатауленні да спатканя зноў назначанаго р.-к. епіскапа Лозінскаго, з дазволу нямецкіх уласьцей пачаты.

Дзеля гэтай мэты ствaрыўся спэцыяльны камітэт.

Эвалюцыя горэ - патрыота. Быўш кіраўнік мейсцовых нацыяналістаў і субсыдаванай рэптыліі «Минское Слово», крэшчоны Мэндэль Шоффэр, як аказываецца напраўляецца ні у Харбін, а у Пецярбург працаваць у кругах совдэпаў...

Як кажуць, ен зноў вярнуўся у лоно Ізраіля—так вымагае час.

У міліцыі. Зноў назначанымі камісарамі 2-го і 3-го вучасткааў робіцца чыстка сярод ніжэйшых агентаў міліцыі.

Увоз харчоў у места, забаронены па загаду градоначальства, у хуткім часе будзе часова дазволены.

У месьцкай управе. Месьцкая управа проэктыруе рад мер, пакіраваных да павялічэння даходных стаццеў. Зьменьшэнне расходаў управай прадаўжаецца па ранейшаму.

У народным унівэрсітэці. Заняцці на будоўніцкіх курсах адчыніліся 29 чэрвеня. Плата за уход 50 кап. Лекцыі па стэнаграфіі зноў пачнуцца ад 5-го ліпня. Запісь слухачоў на усе курсы і группы прадаўжаецца.

Хлебны паек, вельмі зьменьшаны, на будучым тыдні мае зноў павялічыцца да 4-х фун. у тыдзень на кожную порцыю з нівялікай прымесью рафініраванай бульбянай мукі.

Лекцыю аб беларускай народнай музыцы мае чытаць у хуткім часе прафэсар менскай кансэрваторыі І. Н. Устюжанінаў.

«Вольная беларусь». № 24 вышоў з друку 30-го чэрвеня. Зьмест такі: Да краевае інтэлігэнцыі, стацця К. Шафнагеля; На біблійны лад, вершы Ясакара; Зіма, канец апаведання М. Гарэцкаго; Сымон Музыка, працяг паэмы Я. Коласа; Хроніка, дробныя вершы, маленькі фэльетон і інш.

Цана асобнаго №—30 кап.

Афіцыяльнае павядамленне нямецкаго вярхоўна[га] камандавання за 1 ліпня 1918 року.

Заходні тэатр вайны.

Група арміяў Кронпрынца Рупрэхта.

Баевая дзеяльнасьць ажывілася у вечары у шмат м[е]сцах фронту. Ажыўленая дзеяльнасьць разведчыкаў прад[аў]жаецца. Апошнія атакі паўночней Альбэра былі адбіты.

Група арміяў Гэрманскаго Кронпрынца.

Паміж рэкамі Эн і Марнай напружаная варожая д[зе]яльнасьць, пяхота у мэтах разведкі шмат разоў перахада[ла] у наступленне. У Сэн-Пьер-Эгль і паўднёвей яго францу[зы] у поўдзень перайшлі пасьля сільнай артылерыйскай пад[рых]тоўкі у наступленне. Яно было адбіто. Так сама піўд[...] акончыліся тут начныя варожыя нападзенні.

Лейтэнант Левэнгардт меў сваю 32-ую перамогу у [па]ветры.

Па закончэных падрахунках лік палонных, узятых, [лі]чачы ад нашаго наступленоя 21-го Марца 1918 г. прайшоўшых праз нашыя зборныя пункты (ні лічучы ра[не]ных, эвакуаваных праз шпіталі) есьць 191.454. З гэт[аго] ліку: ангельцаў—34.939, з іх 2 генэралы і каля 3.100 а[фі]цэраў.

Рэшта падае на португальцаў, бэльгійцаў і амэрыканц[аў].

С поляў бітвы да гэтых пор былі эвакуаваны 2.4[...] гарматаў і 15.024 куляметаў.

Першы Генэрал-кватэрмэйстар **фон-Людэндорф**

Старое у новым.

У нядзелю, 30 чэрвэня, законавучыцель польскай гімназіі, кс. Гергэт, меў пры набажэнстве у катэдральным касьцёлі казанне, пакіраванае проціў беларускаго руху у краю наагул і проціў памочаных спроб да ужывання у некаторых касьцёлах беларускай мовы у асобку.

Прамова, афарбованая бездарнымі нападкамі на не «гонаровую» нацыю беларускую, у стылю клерыкоў з «Ойчызны», усьпеху, як і трэба было чэкаць, ні мела. Слухачы выходзючы па аканчанні імшы с касьцёлу адклікаліся ні зусім прыхільна аб ніўдачнай выхадцы «палітыкуючаго» дух[оў]ніка, разлічанай на псіхалё[гію] масс, каторым доўгімі га[дамі] скрыта падавалося у апла[тку] каталіцкай рэлігіі, нічога [...] ні маючая супольнаго «пол[...] косьць».

Цікава тое, што гэты [дух]оўнік—«палітык» ішчэ [...] время оно» меў ніпрыемн[ыя] стычкі у Пецярбурзі за [...] калючы шовінізм.

Нельга сказаць, каб ён [...] ядыным с такіх, духоўніко[ў] [у] Менску.

Гэтакіх—выбачайце— «[па]лонофілоў», як з другог[о] боку «москвофілаў» у [...] ішчэ, як кажуць, «столькі, [...] хоць грэблю ўсьцілай» і глядзючы на тое, што час [ця]пер саўсім зьмяніўся, яны па свайму, па старому, «п[...]цуюць», «працуюць»... у [...] проці хрысьціянскаго чала[ве]колюбівасьціцтва...

На іх—айцоў Гэргэтаў—[...] менші ляжыць ніадзін г[рэх] сягоняшні проціхрысьціян[скі] учынак,—цэлыя бойкі у ка[сь]цёлах і каля іх паднімалі [...] паміж людпасьцю на Лі[тве] адстаіваючы свае польс[кія] «пляцувкі» у літоўскім ка[сь]цёлі. Новае нічога ні дадас[ць] да старога. Сеяць звацу па[між] людзьмі адзае веры—ім ні [...] віна, гэто зрабілося іх на[...]гом. Добрым словам іх ні з[...] стыдзіш, ні застановіш. А[ле] рабіць з імі нічога ні трэ[ба]. «Той хто падняў меч, ад [...] і загіне».

Словы Папа. Хрыстов[ага] Касьцёлу ні могуць ні спр[авяд]дзіцца.

А о. о. Гергэты падняліі [...] і вывіваюць ім ужо ні ад[...] год і ні адзін дзесятак гад[оў].

Тутэйшы католік.

Рэдактар **А. Прушынскі.**

Выдавецтво **«Т-во Заранка.»**

Друкарня Я. А. Грынблята.